Слаўся, Айчына ты наша свабодная!

Голас Радзімы

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАЙ СЕКЦЫІ КАМІТЭТА ЗА ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ І РАЗВІЦЦЁ КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ З СУАЙЧЫННІКАМІ

№ 15 (599) | Люты 1962 г. | Год выдання 8-ы

НАШ КЛОПАТ

І шэсць мацерыкоў—не воз...
З дугой-вясёлкай фарбаў
Зямля грукоча між нябёс
З усім рухомым скарбам.
Ды дзесьці зноўку для вайны
Няспынна грузы грузяць.
Кладуцца каменем яны
Цяжкім Зямлі на грудзі.
І клопат мой — дапамагчы
Зямлі ў вялікай справе:
Перакаваць хутчэй мячы
На кельмы і аралы,
Каб толькі — мірны скарб людзей
І — перапёлкі ў жыце...
І стане ўсёй Зямлі лягчэй
Каціцца па арбіце.

Генадзь КЛЯЎКО.

НА ПРАСТОРАХ ЛЮБІМАЙ АЙЧЫНЫ

У саўгасе «Бярозкі» Гомельскага раёна праходзіў мнагадзённы семінар механізатараў вобласці па комплекснай механізацыі вырошчвання кукурузы і цукровых буракоў. На здымку: слухачы семінара на практычных занятках.

Куба не адзінокая

Савецкі ўрад выступіў з заявай, у якой рашуча асуджаюцца агрэсіўныя планы ў адносінах да Кубы. Увага народаў, гаворыцца ў заяве, зноў прыкавана да раёна Карыбскага мора, дзе ЗША ўжо доўгі час вядуць то скрытую, то адкрытую і крывавую барацьбу супраць свабоды і незалежнасці Рэспублікі Куба. Інтэрвенцыя і блакада, тэрор і дыверсіі, грубы націск і шантаж — увесь гэты імперыялістычны арсенал падрыўных сродкаў скіраваны супраць мужнага кубінскага народа.

Нарада міністраў замежных спраў ААД (Арганізацыя амерыканскіх дзяржаў), якая нядаўна закончылася ў Пунта-дэль-Эстэ (Уругвай), была задумана як своеасаблівае судзілішча над рэвалюцыйнай Кубай і пралог да новых актаў агрэсіі супраць яе, указвае ўрад СССР. Цяпер стала відавочным, што нарада нанесла больш шкоды самім ЗША, чым Кубе.

Нарада ў Пунта-дэль-Эстэ — гэта лішняя ілюстрацыя таго, з якой пагардай урад ЗША адносіцца да элементарных норм міжнароднага права, прынцыпаў і мэт Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Дабіваючыся рашэння аб выключэнні Кубы з ААД, ЗША толькі падкрэсліваюць, што для іх ААД— не рэгіянальная арганізацыя ААН, а фактычна яшчэ адзін замкнёны ваенна-палітычны блок, накіраваны сваім вастрыём супраць нацыянальна-вызваленчай барацьбы народаў Лацінскай Амерыкі. ААД— гэта не месца, дзе невінаваты знаходзіць абарону, а, наадварот, месца, дзе на галаву непакорнага апускаецца «вялікая дубінка».

Адзначыўшы, што амерыканскія дзяржаўныя дзеячы сцвярджаюць, быццам бы Куба пагражае ЗША, Савецкі ўрад у сваёй заяве падкрэслівае, што не Куба спрабуе экспартаваць рэвалюцыю ў ЗША або ў якую-небудзь іншую краіну, а ЗША экспартуюць контррэвалюцыю на Кубу і стараюцца знайсці саўдзельнікаў гэтага сярод лацінаамерыканскіх краін.

У заяве ўрада СССР адзначаецца, што ЗША накідваюцца на Кубу не таму, што яна каму-небудзь пагражае, а таму, што пэўныя колы ў ЗША ніяк не могуць змірыцца з тым, што кубінскі народ падняў галаву, пачаў жыць сваім незалежным жыццём, ды яшчэ адважыўся выбраць грамадскі лад, які адрозніваецца ад грамадскага ладу ЗША.

Цяжка сказаць, гаворыцца ў заяве Савецкага ўрада, што пераважае ў цяперашняй палітыцы ЗША ў адносінах да Кубы: нянавісць да ўсяго перадавога, да ідэй сацыяльнага прагрэсу, ці апаска, што прыклад Кубы акажацца заразлівым для народаў неафіцыяльных калоній ЗША, прывядзе да развалу нябачнай каланіяльнай імперыі ЗША, якая распасцерлася на велізарных прасторах у Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыцы. Але так ці інакш, застаецца фактам, што палітыка ЗША ў адносінах да Кубы стварае сур'ёзную пагрозу міжнароднаму міру і бяспецы.

Па якому праву, па якіх законах урад ЗША арганізоўвае і накіроўвае агрэсію супраць іншай краіны, абвінавачваючы яе ў тым, што гэта краіна стварыла іншы сацыяльны лад, іншую дзяржаву, чым хацелася б Злучаным Штатам Амерыкі. Калі ўрад ЗША, падкрэсліваецца ў заяве, прысвойвае сабе гэта права, то ён становіцца на вельмі хісткую глебу, таму што ЗША, як гэта вядома, не з'яўляюцца ўладальнікам ваеннай магутнасці, якая дазволіла б ім дыктаваць свае ўмовы іншым краінам. Дзяржаўным дзеячам ЗША трэба мець на ўвазе і не забываць, што ёсць іншыя краіны, якія маюць не менш грозную зброю, стаяць на варце міру і гатовы перашкодзіць развязванню новай вайны.

Не трэба варажыць на кафейнай гушчы, дзе і вакол якіх дзяржаў якія замежныя базы размешчаны. Савецкі Саюз ведае іх размяшчэнне гэтак жа, як ведаюць гэта і ў Злучаных Штатах Амерыкі, як ведае гэта і ўвесь свет. Калі ўрад ЗША пагражае Кубе, то няхай ён зробіць вывад у адносінах да тых краін, дзе размешчаны ваенныя базы Злучаных Штатаў Амерыкі. Той-сёй у ЗША яшчэ робіць стаўку на палітыку «з пазіцыі сілы», працягвае бразгаць зброяй, пагражаць іншым міралюбівым дзяржавам, але гэта палка з двума канцамі. Калі ЗША возьмуцца за адзін канец, то іншыя дзяржавы могуць узяць яе за другі канец і дзейнічаць ёю супраць тых сіл, якія ЗША захочуць выкарыстаць для пагрозы Савецкаму Саюзу і іншым міралюбівым дзяржавам.

Народы Савецкага Саюза, гаворыцца ў заяве, у захапленні ад гераічнага кубінскага народа, выказваюць свае гарачыя пачуцці да народа Кубы, да яго самаадданай барацьбы за новае жыццё. Паміж Савецкім Саюзам і Кубай устанавіліся адносіны шчырай дружбы, заснаванай на раўнапраўі, узаемавыгадным супрацоўніцтве, павазе суверэнітэту.

Савецкі Саюз выступаў і будзе ў далейшым выступаць на баку кубінскага народа ў яго справядлівай барацьбе, аказваў і будзе ў далейшым аказваць яму дапамогу, як гэта прынята паміж народамі дружалюбных суверэнных дзяржаў. Аказваючы дапамогу Кубе, Савецкі Саюз выконвае не толькі свой абавязак перад народам гэтай краіны, але і становіцца на абарону свяшчэннага для ўсіх народаў права на свабоду і незалежнае існаванне.

Савецкі ўрад адзначае, што Куба не адзінокая, што ў яе многа сяброў не толькі ў Лацінскай Амерыцы, але і ва ўсім свеце і сярод іх — Савецкі Саюз. Рэспубліка Куба, як аб гэтым ясна заявіў М. С. Хрушчоў, заўсёды можа разлічваць на дапамогу і падтрымку з боку савецкага народа. Вядомыя папярэджанні Савецкага ўрада па адрасу ворагаў народнай Кубы застаюцца ў сіле і сёння.

Заяўляючы аб сваёй салідарнасці з рэвалюцыйнай Кубінскай Рэспублікай, падкрэсліваецца ў заяве ўрада СССР, Савецкі Саюз выказвае ўпэўненасць у тым, што, абапіраючыся на падтрымку міралюбівых дзяржаў, гераічны кубінскі народ адстаіць сваю незалежнасць, атрымае перамогу ў сваёй справядлівай гістарычнай барацьбе.

(ТАСС).

ЗВЫШМАГУТНЫ ПРЭС

МАСКВА. Новы звышмагутны малагабарытны гідраўлічны прэс стварылі машынабудаўнікі Падмаскоўя. Гэты унікальны агрэгат намаганнем у 15 тысяч тон адрозніваецца ад існуючых прынцыпова новай схемай, якая дае магчымасць пры штампоўцы вырабаў эканоміць значную колькасць металу. З дапамогай гэтага прэса забяспечваецца масавы выраб буйных паковак для газатурбінных рухавікоў, якія ўстанаўліваюцца на цеплавых электрастанцыях. Пры яго эксплуатацыі зніжаецца працаёмкасць работ на 30 працэнтаў, рэзка павышаецца прадукцыйнасць працы. Падлічана, што ўжыванне гэтых прэсаў збераж э народнай гаспадарцы краіны многія мільёны рублёў.

АТЛАС АНТАРКТЫКІ

ЛЕНІНГРАД. Больш як дваццаць навукова-даследчых устаноў краіны ўдзельнічаюць у стварэнні двухтомнага атласа Антарктыкі. У Арктычным і Антарктычным інстытуце, які кіруе гэтымі работамі, складзен пробны макет атласа.

У першы том увойдзе каля 400 карт і графікаў. Яны дадуць уяўленне аб розных прыродных з'явах у Антарктыцы, адлюструюць вынікі вывучэння інтэнсіўнасці касмічных праменняў, палярных ззянняў, іёнасферы, тэктанічных асаблівасцей і будовы зямной кары. Гляцыялагічныя карты пакажуць рух леднікоў, таўшчыню снежна-ледніковага покрыва, размеркаванне ў ім тэмператур, фізічныя ўласцівасці лёду.

Другі, тэкставы том атласа будзе змяшчаць тлумачальны матэрыял да карт і манаграфічнае апісанне розных прыродных з'яў у Антарктыцы.

Аб ходзе складання атласа, які выйдзе ў свет у 1964 годзе, расказаў у сваім дакладзе на навуковай сесіі Арктычнага і Антарктычнага інстытута кандыдат геаграфічных навук Е. С. Каратке віч.

На сесіі былі заслуханы таксама даклады па розных праблемах вывучэння прыроды Арктыкі і Антарктыкі.

Прадукцыя Гомельскага станкабудаўнічага завода вядома не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі: яна экспанавалася на Міжнароднай выстаўцы ў Рэспубліцы Самалі. На здымкі: інжынер—канструктар завода Юрый Фёдараў.

Добра працуюць будаўнікі на ўзвядзенні жылых аб'ектаў Салігорскага калійнага камбіната. На здымку: перадавы муляр Міхаіл Герасімовіч.

Заслужаным поспехам карыстаецца харавая капэла Брэсцкага клуба чыгуначнікаў. Таленавітаму калектыву прысвоена званне Народнай харавой капэлы. На здымку: выступленне Народнай харавой капэлы Брэсцкага клуба чыгуначнікаў. Саліст — Анатолій Малецкі.

Волжская нафта ідзе ў Чэхаславакію

Нядаўна ўступіла ў строй адна з перапампоўваючых станцый нафтаправода «Дружба». Помпы станцыі працуюць спраўна. Волжская нафта пайшла да савецка-чэхаславацкай граніцы.

Карэспандэнт агенцтва друку Навіны (АДН) звязаўся па тэлефоне з міністрам хімічнай прамысловасці ЧССР таварышам Йозефам Пучыкам і папрасіў расказаць аб значэнні гэтага нафтаправода для эканомікі рэспублікі.

— Пуск у эксплуатацыю нафтаправода «Дружба», — сказаў Йозеф Пучык, — забяспечыць транспарціроўку савецкай нафты ў Чэхаславакію, Венгрыю, Польшчу і ГДР. Дзякуючы гэтаму вытворчасць дызельнага паліва ў Чэхаславакіі павысіцца ў 1965 годзе на 60 працэнтаў, асфальту — больш чым удвая. З савецкай нафты мы пачнём вырабляць прадукты, у прыватнасці, сінтэтычны этылавы спірт і этылавы бензол. Яны з'явяцца сыравінай для атрымання штучнага каўчуку і новых відаў пластмас.

Будаўніцтва нафтаправода з'яўляецца доказам цеснага эканамічнага супрацоўніцтва сацыялістычных краін, заснаванага на брацкай узаемадапамозе.

БРАЦТВА

ГУТАРКІ АБ ПРАГРАМЕ КПСС

КАМУНІЗМ ВЫКОНВАЕ ГІСТАРЫЧНУЮ МІСІЮ ВЫЗВАЛЕННЯ ЎСІХ ЛЮДЗЕЙ АД САЦЫЯЛЬНАЙ НЯРОЎНАСЦІ, АД УСІХ ФОРМ ПРЫГНЕЧАННЯ І ЭКСПЛУАТАЦЫІ, АД ЖАХАЎ ВАЙНЫ І СЦВЯРДЖАЕ НА ЗЯМЛІ МІР, ПРАЦУ, СВАБОДУ, РОЎНАСЦЬ, БРАЦТВА І ШЧАСЦЕ ЎСІХ НАРОДАЎ.

(З Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза).

Камунізм сцвярджае на зямлі БРАЦТВА, тое брацтва, аб якім марылі лепшыя розумы ўсіх пакаленняў, усіх часоў. Тое брацтва, якое будзе панаваць на зямлі пасля перамогі камунізма — самага лепшага, самага справядлівага грамадства на зямлі.

«Свабода, роўнасць, брацтва!» — гэтыя словы былі на сцягах буржуазных рэвалюцый XVIII—XIX стагоддзяў. Аднак, прыйшоўшы да ўлады, буржуазія груба парушала свой дэвіз, які дазволіў ёй часова прыцягнуць на свой бок усе класы, незадаволеныя феадальнымі парадкамі.

Сцяг барацьбы за брацтва людзей працы ўпершыню быў узняты рабочым класам — самым перадавым, самым рэвалюцыйным класам грамадства. Накрэсленыя на гэтым сцягу словы «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» сталі баявым дэвізам інтэрнацыянальнага руху за камуністычную перабудову грамадства, за перамогу сапраўднай свабоды, роўнасці і брацтва.

Савецкі народ законна ганарыцца тым, што яму першаму ўдалося скінуць ланцугі сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, устанавіць новы тып улады, улады рабочых і сялян.

Створаны воляй і добраахвотнай згодай народаў, Савецкі Саюз з'явіўся першым у гісторыі сацыялістычным брацтвам нацый, заснаваным на прынцыпах узаемнай дапамогі і ўзаемнай павагі. Кожны народ у нашай вялікай краіне лічыць сваім інтэрнацыянальным абавязкам дапамагаць іншым народам. Брацтва народаў Савецкага Саюза дае магчымасць з году ў год павышаць матэрыяльны дабрабыт працоўных.

Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў гаворыць: «На змену аджываючаму капіталістычнаму грамадству прыходзіць новае, справядлівае грамадства, якое забяспечвае роўныя ўмовы, дае ўсе даброты кожнаму працоўнаму чалавеку. Цудоўнымі кветкамі свабоды, роўнасці багацця і міру ўсыпаны шлях гэтага грамадства, і пераможнае шэсце яго нястрымна. Такі закон гістарычнага развіцця».

Наша партыя заўсёды выхоўвала працоўных у духу раўнапраўя, брацтва і дружбы, у духу таварыскай узаемадапамогі. Свята захоўваючы нацыянальныя традыцыі і нацыянальныя пачуцці кожнага народа, партыя заўсёды вяла барацьбу з праяўленнем нацыяналізму, з нацыяналістычнай абмежаванасцю. Партыя паслядоўна праводзіла палітыку забеспячэння **фактычнай роўнасці нацый,** планамерна развівала эканоміку і культуру ўсіх савецкіх рэспублік. Непарушная дружба, замацаваная ў барацьбе за сацыялізм, раўнапраўе, братняя ўзаемадапамога і супрацоўніцтва ў барацьбе за перамогу камунізма — такія характэрныя рысы нацыянальных адносін у СССР. Прыродныя багацці і матэрыяльныя каштоўнасці любой нацыянальнай рэспублікі з'яўляюцца неад'емнай часткай багацтваў, якія належаць усяму народу. Таму і задачы, пастаўленыя партыяй перад адной якой-небудзь рэспублікай, з'яўляюцца агульнанароднымі задачамі, і ўсе народы ўдзельнічаюць у іх вырашэнні. Так было, напрыклад, з асваеннем цалінных земляў Казахстана, калі ўсе народы Савецкага Саюза дапамагалі Казахскай рэспубліцы вырашаць гэтую адказную задачу.

Адносіны дружбы, брацтва, узаемнай дапамогі пануюць паміж усімі краінамі сацыялістычнага лагера. Усе міралюбівыя народы зямнога шара звяртаюцца да Савецкага Саюза са словамі павагі і падзякі.

Чэшскі пісьменнік Ян Піларж гаворыць: «Мы перажываем усё, што робіцца ў Савецкім Саюзе так, як быццам усё гэта адбываецца ў нас. Мы трывала стаім у радах тых, хто змагаецца за мір і пракладвае дарогу ў камунізм. Як пераможны гімн гучаць словы Праграмы: «Камунізм зацвярджвае на зямлі Мір, Працу, Свабоду, Роўнасць, Брацтва і Шчасце ўсіх людзей на зямлі». У гэтых словах сканцэнтраваны запаветныя мары чалавецтва, якое жадае, каб на зямлі панавала сапраўднае брацтва, камуністычнае брацтва. Моцныя, сапраўды брацкія адносіны паміж нашымі народамі, могуць служыць пераканаўчым прыкладам».

«Брацтва сацыялістычных краін стала магутным палітычным і эканамічным фактарам», — гаворыць польскі публіцыст Б. Вуйціцкі.

«Падобна свяшчэнным багам нашай міфалогіі, інда-савецкая дружба праяўляецца ў самых розных формах. Зусім нядаўна яна выразілася ў палымянай падтрымцы Савецкім Саюзам вызвалення намі Гоа і прымяненні СССР права вета ў Савеце Бяспекі, якое звязала імперыялістаў па руках і нагах. Яна ўвасабляецца ў распаленых балванках сталі, якія паступаюць на пракатныя станы Бхілайскага металургічнага камбіната.

Яе можна бачыць у залатых калоссях пшаніцы, якія паднімаюцца на некалі ссушаных бязводных землях Сурат-гарха, у нафтавых фантанах Анклешвара...

Яна — у сэрцы кожнага індуса», — сказаў Даршан Сінгх.

У той час, як імперыялісты імкнуцца эканамічна задушыць дзяржавы, якія змагаюцца за сваю незалежнасць, савецкі народ, народы іншых сацыялістычных краін працягваюць гэтым краінам братнюю руку дапамогі. Вось і зусім нядаўна Маскоўскі завод імя Ул. І. Леніна адгрузіў электрарухавікі, зробленыя для гераічнай Рэспублікі Кубы.

Ні аб якім брацтве ў капіталістычным свеце не можа ісці гутарка. Якое брацтва можа быць паміж кучкай мільянераў і мільярдэраў, якія бескантрольна распараджаюцца ўсімі багаццямі капіталістычнага свету, і мільёнамі людзей працы, якія церпяць пакуты і знявагу? Як абвінаваўчы акт капіталізму гучыць пісьмо амерыканскай маці, надрукаванае ў правінцыяльнай газеце «Джэксанвіл стар»: «Перад няпісанымі законамі нашага грамадства бяссільны ўсе чалавечыя законы розуму, гуманнасці, брацтва. Усё добрае, што ёсць у чалавеку, заплявана, растаптана, абсмяяна і калі яшчэ не забіта, то сур'ёзна надломлена».

Ідэя брацтва набывае ў нашы дні ўсё больш глыбокі сэнс. Яна праяўляецца ў братніх сувязях краін магутнага, несакрушальнага лагера сацыялізма. Расце і ўмацоўваецца брацтва рабочых усіх краін, якія змагаюцца пад сцягам марксізма-ленінізма, пралетарскага інтэрнацыяналізму за мір, дэмакратыю, нацыянальную незалежнасць і сацыялізм.

Адна з лепшых краўчых Столінскага райпрамкамбіната, рээмігрантка з Аргенціны Соф'я Міхнавец.

У прасторныя светлыя школы

Выдатна сказаў вялікі пралетарскі пісьменнік Максім Горкі: «Самы лепшы будынак, які чалавек пабудаваў за сваю гісторыю, — гэта школа». Сапраўды, яна з ранніх год уводзіць нас у цудоўны свет ведаў, дапамагае выбраць правільны шлях у жыцці, прышчапляе самыя лепшыя навыкі, рысы характару, развівае густы, імкненні.

І, бадай, нідзе на зямлі гэтыя памяшканні не будуюцца такімі прыгожымі, як у нашай савецкай краіне. У нас вучацца абсалютна ўсе: дзеці рабочых, калгаснікаў, інтэлігентаў, нават дарослыя, пажылыя людзі. Толькі на тэрыторыі нашага раёна працуе 11 сярэдніх, 10 васьмігадовых і 62 пачатковыя школы. Дзяцей навучаюць 580 высокакваліфікаваных настаўнікаў. Многа гэта ці мала? Давайце параўнаем. Да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Ігумене налічвалася адно двухкласнае вучылішча і адно павятовае, некалькі яўрэйскіх школ і адна прыватная школа. На тэрыторыі ўсяго ігуменскага павету было прыкладна 44 народныя школы, а ў сяле Мар'іна Горка — ніжэйшая сельскагаспадарчая школа, у якой навучалася 60—66 чалавек. Да таго ж трэба мець на ўвазе, што павет быў у разы тры — чатыры большы, чым наш цяперашні раён.

Загляніце цяпер у любы сельсавет — там ёсць некалькі сярэдніх школ, у кожным населеным пункце — васьмігадовая або пачатковая школа.

Большасць школ новыя. За кошт дзяржаўных капітальных укладанняў пабудаваны Валевачоўская, Грабенская, Чэрвеньская сярэднія школы, рыбгасаўская, Новазелянкоўская васьмігадовыя школы. Метадам народнай ініцыятывы узведзены Рэчкаўская, Вайнілаўская, Калодзежская, Іваніцкая васьмігадовыя і 25 пачатковых школ.

Яшчэ адна школа закладзена мінулай восенню ў г. Чэрвені. У 1962 годзе тут пачнецца ўзвядзенне школы-інтэрната. У Смілавічах такая школа працуе. Дзеці жывуць і вучацца ў ёй на поўным дзяржаўным забеспячэнні.

За апошнія гады ў многіх школах пашырана вучэбная плошча, з'явіліся новыя спецыяльныя кабінеты, залы, добра абсталяваныя майстэрні, дзе дзеці праходзяць вытворчае навучанне. Цяпер, напрыклад, у Грабёнскай сярэдняй школе ёсць цудоўная спартыўная зала, добрыя майстэрні, навучанне арганізавана так, што дзеці разам з агульнымі ведамі атрымліваюць спецыяльнасці механізатараў, паляводаў, жывёлаводаў.

В. ГАЛЕНЧЫК.

Пішуць землякі...

З вялікім задавальненнем чытаю я выступленні М. С. Хрушчова. Асабліва спадабаліся мне яго даклады на XXII з'ездзе партыі, дзе ён проста і пераканальна расказаў аб будаўніцтве камунізма ў Савецкім Саюзе.

Не я адзін прыхільнік цудоўных выступленняў савецкага прэм'ера. Многія з цікавасцю чытаюць яго прамовы. І нават тыя, хто не верыў у рэальнасць савецкіх планаў, цяпер кажуць, што Расія абавязкова ператворыць іх у жыццё.

Я. АЛЕЙНІК.

ФРГ.

ВЕСТКІ З ПАСТАЎ

Вялікай папулярнасцю карыстаецца ў саўгасе «Пастаўскі» самадзейны струнны аркестр. На здымку № 1 вы бачыце даярку Тэафілю Сігізмундаўну Галінскую — актыўную ўдзельніцу аркестра.

— Падзівіцеся, якія мы падобныя!

Гэтыя блізняткі (здымак № 2) Стася, Галя і Аня — нарадзіліся ў 1961 годзе ў сям'і калгаснікаў вёскі Лынтупы Леакадзіі і Станіслава Гарнушаў. З першых дзён нараджэння за дзецьмі вёўся добры медыцынскі нагляд, дзяўчынкі растуць здаровымі і вясёлымі.

Фота **М. Чарняўскага.**



Растуць маладыя кадры

Другі год працуе ў Баранавічах тэхнікум лёгкай прамысловасці. Ён рыхтуе кадры спецыялістаў для баваўнянага камбіната, які будуецца ў горадзе, трыкатажнай, швейнай фабрык і іншых прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. Тут рыхтуюцца тэхнікі-тэхналогі швейнай вытворчасці, тэхнікі-механікі па абсталяванню і тэхналогіі тэкстыльнай вытворчасці.

У тэхнікуме ёсць агульнатэхнічнае вячэрняе аддзяленне, дзе без адрыву ад вытворчасці вучацца работнікі прадпрыемстваў і будоўляў горада. Усяго ў Баранавіцкім тэхнікуме лёгкай прамысловасці займаецца 360 чалавек. Хто яны — студэнты тэхнікума? Гэта Авіян Аўрашчанка і Валянцін Старыковіч — былыя рабочыя завода аўтамабільных агрэгатаў, Зіна Саўчук — работніца швейнай фабрыкі, Валя Кічкайла і Сяргей Круцько — электраманцёры, Антон Акалатовіч, Леанід Пятрушка, Іван Бабко, Зіна Ерашук — калгаснікі.

У нашай краіне навучэнцам усіх навучальных устаноў аказваецца ўсямерная дапамога. Так, напрыклад, для здачы экзаменаў студэнтам завочных і вячэрніх аддзяленняў штогод прадастаўляюцца аплочваемыя водпускі два разы ў год, навучэнцы маюць рад іншых ільгот і пераваг (вольныя дні з аплатай, дадатковыя водпускі і г. д.). Як правіла, студэнты — завочнікі і вячэрнікі — паказваюць прыклад не толькі ў вучобе, але і ў рабоце. У ліку нашых студэнтаў ударнікі камуністычнай працы: работніцы швейнай фабрыкі Нэля Раўкоўская, Валянціна Юрчык, Ларыса Франтова, Валянціна Храмцэвіч; работніца трыкатажнай фабрыкі Анна Швед. У прыклад іншым мы ставім і слесара вагоннага дэпо Рыгора Казлова, і аглядчыка-аўтаматчыка гэтага ж дэпо Юрыя Швяцова, і многіх іншых.

Зараз у тэхнікуме ідзе другі семестр навучальнага года. Нядаўна тут адкрыліся ноя майстэрні, лабараторыі. Гэта дало магчымасць лепш чым у мінулым годзе, з вялікім набліжэннем да практыкі будаваць вучэбны працэс, рыхтаваць кваліфікаваныя кадры, якія добра ведаюць сваю прафесію.

Ю. ЦЯРЭНЯ,
дырэктар Баранавіцкага тэхнікума лёгкай прамысловасці.

На Енісеі, ля Дзіўных гор

КРАСНАЯРСК. Побач з закаваным лёдам Енісеем быццам струменіцца другая рака — накатаная да бляску бетонная дарога. Яна злучае краявы цэнтр з будаўнічай пляцоўкай найвялікшай у свеце Краснаярскай ГЭС. Бясконцай чарадой ідуць па ёй аўтамашыны, нагружаныя цэментам, арматурай, механізмамі, дэталямі стандартных дамоў.

Расце будоўля — расце будучы горад краснаярскіх гідрабудаўнікоў — Дзіўнагорск. На схілах Дзіўных гор сярод сасновага лесу ўзнімаюцца кварталы новых жылых дамоў. Тут працуюць пяць школ, клуб, кінатэатр, некалькі спецыялізаваных магазінаў. На набярэжнай Енісея закладзена вялікая гасцініца. Не праходзіць тыдня, каб у пасёлку не спраўлялі наваселля. У выбарах у Вярхоўны Савет СССР у Дзіўнагорску прымуць удзел каля 15 тысяч выбаршчыкаў — амаль дзевяць тысяч з іх працуюць на асноўных збудаваннях.

ВЕТРЫ ДУЮЦЬ НЕ ТАК, ЯК ХОЧУЦЬ КАРАБЛІ

Адказваем на пытанні землякоў

Летам 1961 года рэдакцыя атрымала пісьмо з Нью-Йорка ад нашага земляка А. Сапежкі. Стары эмігрант прасіў растлумачыць, чаму граніцы сучаснай Беларусі не адпавядаюць граніцам Паўночна-Заходняга краю, у якім знаходзіліся да рэвалюцыі раёны з беларускім насельніцтвам. Рэдакцыя папрасіла мяне, каб я адказаў нашаму земляку на гэта пытанне, тым больш, што яно можа цікавіць і іншых. Мой артыкул «Адказ земляку А. Сапежку» быў надрукаваны ў № 58 «Голасу Радзімы» за 1961 год і перададзены па радыё.

Гэты артыкул прачыталі нашы землякі. Рэдакцыя і я, як аўтар, атрымалі шмат пісьмаў ад чытачоў. Былі сярод іх і пісьмы, з якіх я бачыў, што не ўсе нашы землякі зразумелі гэта пытанне, а некаторыя ўведзены ў зман беларускімі нацыяналістамі, якія пасля вайны разам з гітлераўскімі акупантамі ўцяклі за мяжу. Цяпер, выслугоўваючыся перад новымі гаспадарамі, яны працягваюць рабіць тое, што і рабілі ў час гітлераўскай акупацыі — паклёпнічаюць на савецкі народ, фальсіфікуюць гісторыю.

Блытаючы гісторыю з геаграфіяй, яны, напрыклад, сцвярджаюць, што Беларусь як цэлая адміністрацыйна - тэрытарыяльная адзінка ўжо існавала да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Яны спрабуюць даказаць, што Паўночна-Заходні край і Беларусь — гэта адно і тое ж. Але ж кожны савецкі школьнік ведае, што гэта не адно і тое ж. Паўночна-Заходні край — гэта чыста геаграфічны тэрмін, які з'явіўся ў літаратуры ў сярэдзіне мінулага стагоддзя, пасля таго, як Мікалай I афіцыяльна забараніў ужываць слова Беларусь.

Адміністрацыйна - тэрытарыяльныя рамкі гэтага краю ніколі не былі дакладна вызначаны. Звычайна сюды ўключалася шэсць паўночна-заходніх губерняў: Віцебская, Мінская, Магілёўская, Віленская, Гродзенская і Ковенская, з іх першыя тры называліся беларускімі, а Віленская, Гродзенская і Ковенская — літоўскімі. Што датычыцца Смаленскай губерні, то яна існавала і да паяўлення чыста геаграфічнага тэрміну «Паўночна-Заходні край» і пасля яго паяўлення. Некаторыя гісторыкі і статысты ўключалі Смаленскую губерню ў гэты край, а іншыя не ўключалі, але гэта сугуба ўмоўна.

Цяпер аб тэрытарыяльных граніцах паўночна-заходніх губерняў Расіі. Нагомнім, што царскі ўрад, баючыся росту нацыянальна-вызваленчага руху, свядома ігнараваў этнаграфічныя, эканамічныя і культурныя асаблівасці насельніцтва гэтых губерняў і не дапускаў стварэння кампактных нацыянальна - адміністрацыйных аб'яднанняў. Таму этнаграфічныя граніцы Беларусі ў дарэвалюцыйны перыяд ніколі не супадалі з адміністрацыйнымі граніцамі паўночна-заходніх губерняў.

З шасці паўночна-заходніх губерняў поўнасцю беларускімі былі фактычна толькі дзве — Мінская і Магілёўская. У склад жа Віцебскай губерні, акрамя беларускіх паветаў, былі ўключаны тры паўночна-заходнія латгальскія (інфляндскія) паветы — Дзвінскі, Рэжыцкі і Люцінскі, дзе пераважную большасць насельніцтва складалі латышы. Акрамя таго, у паўночна-усходнюю частку гэтай жа губерні аказаліся ўключанымі чатыры рускія паветы: Невельскі, Вяліжскі, Суражскі і Себежскі. У склад Гродзенскай губерні ўваходзілі тры паветы (Беластоцкі, Сакольскі і Бельскі) з пераважна польскім насельніцтвам. У Віленскай губерні толькі ўсходнія паветы былі пераважна з беларускім насельніцтвам: Вілейскі, усходняя частка Віленскага, Ашмянскі і Лідскі паветы (без Эйшышскай воласці), а таксама паўднёва-усходняя частка Свенцянскага павета. У астатняй частцы гэтай губерні жылі літоўцы і палякі. У Ковенскай губерні зусім не было беларускіх паветаў.

Такім чынам, у складзе пяці паўночна-заходніх губерняў беларускія паветы займалі каля 73 працэнтаў тэрыторыі.

Паўстае пытанне, ці можна пасля гэтага сцвярджаць, што Беларусь і Паўночна-Заходні край — гэта адно і тое ж паняцце? Безумоўна, не.

Яшчэ больш абсурдна і фальшыва гучыць атоесамленне нацыяналістамі Беларусі і Вялікага княства Літоўскага. Тут яны дагаварыліся да таго, што фактычна ніякай Беларусі гістарычна ніколі не існавала, што існавала толькі «Вялікае княства Літоўскае або Літва, якое было ўключана ў склад Расійскай імперыі... што тэрмін «Беларусь», «беларусы» ўзнік як чыста рэлігійны тэрмін, пазней выконваў ролю геаграфічнага тэрміну для вызначэння толькі ўсходняй часткі Літвы або сённяшняй Беларусі»...

Напомнім у сувязі з гэтым некаторыя агульнавядомыя гістарычныя факты. У сярэдзіне XIII і ў пачатку XIV стагоддзяў літоўскія князі, выкарыстаўшы феадальную раздробленасць Русі і нашэсце татара-манголаў, захапілі спрадвечныя заходнерускія (беларускія) землі і ўключылі іх у склад Вялікага княства Літоўскага. Сустрэўшыся на захопленай тэрыторыі з больш перадавой культурай, літоўскія заваёўнікі, паводле вобразнага выразу А. Міцкевіча, быццам бы «растварыліся» сярод заваяваных. Яны пачалі засвойваць рускую (беларускую) мову, быт і норавы мясцовага насельніцтва і нярэдка прымалі праваслаўе. Ніякіх карэнных змен не ўнеслі літоўцы ў існаваўшыя ў заходнерускіх землях феадальныя адносіны. Беларускае насельніцтва гэтых зямель па-ранейшаму цягнулася да Масквы, да рускай дзяржавы, і ні на адзін дзень не спыняла барацьбы з літоўскімі, а затым і з польскімі захопнікамі за ўз'яднанне са сваёй маці — рускай дзяржавай. Суцэльнай выдумкай, грубай фальсіфікацыяй гістарычнай рэчаіснасці з'яўляецца сцвярджанне беларускіх буржуазных нацыяналістаў аб тым, што быццам бы пад уладай літоўскіх князёў беларускі народ перажыў «залаты век» сваёй гісторыі.

Што датычыцца паходжання самога тэрміну «Белая Русь», то і тут нацыяналісты грашаць супраць праўды. Трэба сказаць, што паходжанне гэтага тэрміну пакуль яшчэ канчаткова не высветлена навукай. Адны даследавальнікі спрабуюць растлумачыць яго колерам адзення, светлым колерам валасоў і блакітнымі вачыма карэнных жыхароў — беларусаў. Іншыя звязваюць паходжанне гэтага тэрміну з процілеглым тэрмінам «Чорная Русь», якім называлася частка заходнерускіх зямель, захопленая ў першай палавіне XIII стагоддзя літоўскімі князямі (раён Гродна, Слоніма, Ноўгарадка). Паняцце «чорны» абазначала стан залежнасці, падпарадкавання і было працілеглым паняццю «белы», г. зн. свабодны, незалежны. Магчыма, што назва «Белая Русь» замацавалася ў першай палавіне XIII стагоддзя за той часткай заходніх зямель Русі, якія ў той час не былі захоплены ні татара-манголамі, ні літоўцамі. Пазней гэта назва была распаўсюджана на ўсю тэрыторыю заходніх зямель Русі.

Беларускі народ, як і іншыя народы былой царскай Расіі, атрымаў права на самавызначэнне і стварэнне сваёй дзяржаўнасці толькі ў выніку перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і ажыццяўлення на практыцы ленінскай нацыянальнай палітыкі Камуністычнай партыі. Сучасная БССР упершыню ў гісторыі аб'яднала ўсе спрадвечна беларускія землі. Абвяргаючы гэтыя бясспрэчныя гістарычныя факты, нацыяналісты зноў імкнуцца даказаць недаказальнае, тое, што свайго нацыянальнага і дзяржаўнага росквіту Беларусь дасягнула не ў выніку перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, не за гады Савецкай улады, а ў часы Вялікага княства Літоўскага і яго пазнейшай пераемніцы «Беларускай народнай рэспублікі».

З пісьмаў у рэдакцыю відаць, што за граніцай мала такіх прастакоў, якія вераць падобным сцвярджанням. На самай справе, хто паверыць нацыяналістам, што іх яўна контррэвалюцыйныя буржуазна-нацыяналістычныя арганізацыі сапраўды выказвалі інтарэсы і волю працоўнага народа Беларусі?

Агульнавядома, што працоўныя масы Беларусі, аб'яднаўшыся вакол партыі бальшавікоў і Савецкай улады, з пагардай і нянавісцю адвярнуліся ад гэтых арганізацый і выкінулі іх са сваёй зямлі з апошнімі замежнымі інтэрвентамі.

Нацыяналісты імкнуцца ўсяляк абяліць і абараніць гэтыя палітычныя трупы, прыпісваючы ім нейкую роль і значэнне ў мінулым.

Якая ж была іх роля ў сапраўднасці? 15 снежня 1917 года контррэвалюцыйная Беларуская рада ў кантакце з правымі эсэрамі склікала «беларускі кангрэс», быццам для вырашэння пытання аб лёсе Беларусі. Прыкрываючыся дэмагагічнымі заявамі аб прызнанні Савецкай улады ў цэнтры Расіі і жаданні ўстанавіць кантакт з Савецкім урадам у Петраградзе, «кангрэс» катэгарычна выказаўся супраць падпарадкавання мясцовым органам Савецкай улады — Аблвыканкомзаху і Савету народных камісараў і рашыў стварыць свой «цэнтральны орган», да якога павінна была перайсці ўся ўлада ў Беларусі.

У адказ на гэта нахабнае контррэвалюцыйнае выступленне супраць Савецкай улады Саўнарком Заходняй вобласці і фронту — адзіны законны рабоча-сялянскі ўрад у Беларусі — 16 снежня аб'явіў «беларускі кангрэс» распушчаным. Услед за гэтым былі распушчаны Беларуская рада і іншыя контррэвалюцыйныя нацыяналістычныя арганізацыі, у падтрымку якіх не выступіў ні адзін рэвалюцыйны рабочы, ні адзін салдат, ні адзін селянін.

У перыяд нямецкай акупацыі ў Беларусі ў 1918 годзе «рада» зноў усплыла на паверхню. Яна звярнулася да кайзера Вільгельма з просьбай аб апякунстве і ўсяляк дапамагала нямецкім захопнікам распраўляцца з рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі Беларусі. Пасля выгнання немцаў з Беларусі «рада» ўцякла ад народнага гневу ў Вільна і перайшла на службу да замежных разведак.

У 1941 годзе гітлераўскія захопнікі зноў спрабавалі прывесці ў Беларусь аскепкі беларускіх нацыяналістаў на чале з Астроўскім, Ігнатоўскім, Казлоўскім, каб з іх дапамогай устанавіць тут «новы парадак», г. зн. ператварыць беларусаў у рабоў нямецкіх памешчыкаў і капіталістаў. Але толькі нямногім з гэтых верных нямецкіх служак удалося ўцячы з нашай зямлі.

Цяпер, пасля вайны, гэтыя нікчэмныя пігмеі, акапаўшыся на Захадзе, зноў трубяць у сваю старую ахрыпшую нацыяналістычную дуду, стараючыся верай і праўдай служыць сваім новым гаспадарам — амерыканскім імперыялістам. Канчаткова аскандаліўшыся і выкрыўшы сябе ў гады другой сусветнай вайны і не маючы ў сваім арсенале ніякіх новых сродкаў і аргументаў, яны вымушаны выцягваць на святло старыя, пашарпаныя «тэорыі», накшталт тых, што «Масква, рускія прыгнятаюць беларусаў», што тыя ж рускія «тэрытарыяльна абкралі Беларусь» і працягваюць «знішчаць» беларускіх людзей, а вось яны, нацыяналісты, «сапраўдныя беларускія патрыёты», працягваюць змагацца за «свабодную Беларусь», падтрымліваць «нацыянальна-вызваленчыя ідэі».

Яўна скажаючы факты, нацыяналісты спрабуюць далей даказаць, што ўвесь працэс утварэння і развіцця Беларускай Савецкай дзяржаўнасці праходзіў пад дыктоўку Масквы, што Масква тое і рабіла, што пастаянна «гандлявала» беларускай этнаграфічнай тэрыторыяй, перадаючы цэлыя кавалкі яе РСФСР, Літве, Латвіі і Польшчы.

Да ліку «абкрадзеных» тэрыторый яны адносяць Смаленшчыну, Віленшчыну, Дзвіншчыну, Беласточчыну, г. зн. тыя тэрыторыі, якія ўваходзілі раней у геаграфічнае паняцце «Паўночна-Заходні край». Як яны яшчэ Ковеншчыну не далучылі да беларускай этнаграфічнай тэрыторыі, яна ж таксама ўваходзіла некалі ў Паўночна-Заходні край. Нагомнім нашым чытачам, што тады, калі ўладарылі гітлераўскія акупанты, якім дапамагалі нацыяналісты, тэрыторыя Беларусі была звужана амаль да памераў Мінскай вобласці. Чаго тады гэтыя «патрыёты» не змагаліся за волю беларускага народа? Гітлераўскія людаеды не толькі пазбавілі Беларусь адміністрацыйна-тэрытарыяльных граніц, зрабіўшы яе часткай «Остляндa», але знішчалі і сам беларускі народ.

Для нас, савецкіх людзей, пытанне аб граніцах паміж саюзнымі і аўтаномнымі рэспублікамі даўно страціла сваё ранейшае значэнне.

Па меры руху нашай краіны да сацыялізма граніцы паміж асобнымі нацыянальнымі рэспублікамі па сутнасці сціраліся. Гэты працэс узмацняўся ў сувязі з выраўнаваннем эканамічнага і культурнага ўзроўню развіцця нацыянальных рэспублік. «Калі вы спытаеце цяпер, — справядліва заўважае М. С. Хрушчоў, — рускага, украінца, беларуса, ці з'яўляецца для іх актуальным пытанне аб адміністрацыйных граніцах іх рэспублік, думаю, што ў большасці людзей такое пытанне выкліча недаўменне. А чаму? Таму, што ў межах нашай сацыялістычнай дзяржавы ўсе нацыі і народнасці раўнапраўныя, жыццё будуецца на адзінай сацыялістычнай аснове, у аднолькавай ступені задавальняюцца матэрыяльныя і духоўныя запатрабаванні кожнага народа, кожнай нацыянальнасці»

Беларускі народ, як і іншыя народы раўнапраўных савецкіх сацыялістычных рэспублік, абапіраючыся на ўзаемную брацкую дапамогу, ў першую чаргу на дапамогу вялікага рускага народа, стварылі ў сябе буйную сучасную прамысловасць, нацыянальныя кадры рабочага класа і інтэлігенцыі, развілі нацыянальную па форме, сацыялістычную па зместу культуру. Аб'яднанне і згуртаванне

(Заканчэнне на 4-й стар.)

СТАНКЕВІЧ (да гітлераўскага афіцэра): «Бітэ, калі ласка, шаноўны пан...»

Той жа СТАНКЕВІЧ «А дзе ж тыя беларусы?»

ВЕТРЫ ДУЮЦЬ НЕ ТАК, ЯК ХОЧУЦЬ КАРАБЛІ

(Пачатак на 3-й стар.)

раўнапраўных народаў на добраахвотных асновах у адзінай шматнацыянальнай дзяржаве — Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, гаворыцца ў новай Праграме партыі, прынятай XXII з'ездам КПСС, іх цеснае супрацоўніцтва ў дзяржаўным, гаспадарчым і культурным будаўніцтве, брацкая дружба, росквіт іх эканомікі і культуры—важнейшы вынік ленінскай нацыянальнай палітыкі.

У СССР у цяперашні час склалася новая гістарычная супольнасць людзей розных нацыянальнасцей, якія маюць агульныя характэрныя рысы. Яны маюць агульную сацыялістычную Радзіму — СССР, агульную эканамічную базу — сацыялістычную гаспадарку, агульную сацыяльна-класавую структуру, агульны светапогляд—марксізм-ленінізм, агульную мэту — пабудову камунізма, многа агульных рыс у духоўным абліччы, у быце і псіхалогіі. Гэтая супольнасць называецца: савецкі народ.

Паўстае пытанне, ці можа ў такім грамадстве, аб'яднаным брацкімі вузамі народаў, узнікнуць спрэчка аб граніцах, аб якіхсьці ўзаемных тэрытарыяльных прэтэнзіях? Безумоўна, не можа. Таму і паняцце граніц паміж раўнапраўнымі саюзнымі савецкімі рэспублікамі з'яўляецца ў пэўным сэнсе ўмоўным.

З перамогай камунізма ў сусветным маштабе дзяржаўныя граніцы, як вучыць марксізм-ленінізм, адамруць. Што гэта будзе іменна так, паказвае працэс, што адбываецца ў Савецкім Саюзе, які з'яўляецца многанацыянальнай дзяржавай.

Нарэшце, яшчэ раз аб колькасці насельніцтва Беларусі. Ні ў якіх савецкіх статыстычных зборніках няма і ў паміне лічбы 10,5 мільёна насельніцтва Беларусі ў 1920 годзе, аб якой крычаць нацыяналісты. У савецкай статыстычнай літаратуры сапраўды ёсць лічба 10,5 мільёна чалавек — гэта колькасць насельніцтва Беларусі, уключаючы ўсе яе заходнія вобласці, напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. І ніхто гэтай лічбы не ўтойвае.

Згодна з перапісам 1959 года, у Беларускай ССР у цяперашніх яе границах, выключаючы Беласточчыну, якая ўвайшла ў склад Польскай Народнай Рэспублікі, пражывае 8,6 мільёна чалавек. Гэта лічба, безумоўна, менш даваеннай. У гады вайны беларускі народ панёс велізарныя страты. Паводле няпоўных даных, загінула больш двух мільёнаў чалавек, каля паўмільёна беларусаў было вывезена фашыстамі на нямецкую катаргу.

Больш поўныя звесткі аб колькасці знішчаных беларусаў нацыяналістычныя паклёпнікі маглі б атрымаць у фашысцкага ката Адольфа Хойзінгера і яго прадажных наймітаў Астроўскага, Станкевіча і іншых. Станкевіч, напэўна, павінен памятаць, колькі ён асабіста знішчыў насельніцтва ў Барысаве, Баранавічах у бытнасць там нямецкім бургамістрам. Нацыяналістычныя заправілы хацелі б вярнуцца на беларускую зямлю з новымі акупантамі. Так яны прыходзілі тройчы і тройчы былі пракляты народам. Але гэта ім не ўдасца больш. Ветры, як гаворыць арабская прымаўка, дуюць не так, як хочуць караблі. Дададзім: караблі імперыялістычных разбойнікаў.

А. ХАЦКЕВІЧ.

ЛЯ СІНЯГА МОРА

АНГЛІЯ. 300 прадстаўнікоў 39 прафсаюзаў, якія ўваходзяць у Канфедэрацыю рабочых суднабудаўнікоў прамысловасці Англіі, рашуча выступілі з патрабаваннямі павелічэння заработнай платы і скарачэння рабочага тыдня.

* * *

ІНДАНЕЗІЯ. Дзеянні ўрада Японіі, які дазволіў галандскім салдатам прайсці праз Японію на Заходні Ірыян, выклікалі выбух абурэння ў Інданезіі. Японія ашуквае народ і ўрад Інданезіі, калі яна робіць выгляд, што з'яўляецца яе старым сябрам, піша ў перадавым артыкуле газета «Берыта Інданезія».

* * *

АЛЖЫР. «Ультра» — поўныя гаспадары многіх алжырскіх гарадоў. Аб гэтым сведчыць той факт, што ў перыяд з 1 па 15 лютага ў алжырскіх гарадах «ультра» зрабілі 507 тэрарыстычных актаў, у выніку якіх 256 чалавек былі забіты і 490 паранены.

* * *

ПАЎДНЁВЫ В'ЕТНАМ. Гнеў і абурэнне паўднёвав'етнамскага насельніцтва выклікалі новыя правакацыйныя дзеянні кіруючых колаў ЗША, якія пасылаюць на дапамогу марыянетцы Нго Дзінь Дзьему амерыканскія ваенныя падмацаванні. На будучым тыдні ў Паўднёвы В'етнам адправіцца некалькі эсмінцаў амерыканскага 7-га флоту.

* * *

АФІНЫ. Як паведамляе газета «Каціморыні», прынята канчатковае рашэнне аб будаўніцтве вучэбнага ракетнага цэнтра НАТО на грэчаскім востраве Крыце, на паўночны ўсход ад Каніі. Візіты на Крыт вышэйшых амерыканскіх афіцэраў НАТО, якія сталі асабліва частымі за апошні час, звязаны з гэтым рашэннем.

Паводле паведамлення газеты, пад ракетную базу НАТО будзе адведзена вялікая плошча. Будаўніцтва базы, якое будзе каштаваць 50 мільёнаў долараў, даручана амерыканскай кампаніі.

* * *

ПАРЫЖ. Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Франс Прэс з Рабата, урад Марока накіраваў Францыі пратэст у сувязі з налётам, які зрабілі два самалёты французскіх ваенна-паветраных сіл на мараканскі пункт Уджда.

Марока ў сваім пратэсце характарызуе гэты налёт французскіх ваенных самалётаў як «ярка выражаную агрэсію».

* * *

ЛОНДАН. З Англіі ў Брытанскую Гвіяну адпраўлены два вялікія транспартныя самалёты з англійскімі войскамі. Прадстаўнік ваеннага міністэрства заявіў, што да перакідкі гатовы і іншыя падраздзяленні англійскіх войск.

У розных месцах нашай неабсяжнай Радзімы жывуць і працуюць людзі, якія нядаўна вярнуліся з-за рубяжа. Адны з іх пасяліліся ў сваіх родных гарадах і вёсках, другім прышліся да спадобы неабсяжныя цалінныя стэпы і новабудоўлі Алтая і Сібіры — гэтага краю са змрочным мінулым, але цудоўным сучасным і яшчэ лепшай будучыняй. А некаторыя выбралі сабе месцам жыхарства сонечную Крымскую вобласць і пасяліліся на беразе цёплага Чорнага мора. Аб сваім жыцці яны часта расказваюць у пісьмах да землякоў за акіянам. «Пісьмы за акіян» — так і называецца кніжка, выпушчаная Крымскім выдавецтвам, урыўкі з якой мы сёння публікуем.

КОЖНАМУ ЗНАЙШЛАСЯ СПРАВА

Аргенціна, правінцыя Чака,
г. Энрыка-Урвен

Міколу ВІРУНУ.

Ты, Мікола, не рашыўся ехаць з намі. Застаўся. Але я ведаю, што твая цікавасць да нашага жыцця на Радзіме, да жыцця савецкага народа вялікая. Я пастараюся больш поўна задаволіць тваю цікаўнасць, развеяць недавер, які ўсяліла прапаганда нацыяналістаў.

У апошнім пісьме я пісаў табе, Мікола, што жыву так, як дай бог кожнаму. Пабудаваў сабе каменны дом. У ім чатыры пакоі, кухня. Гэта разоў у пяць больш за тваё ранчо. Абзавёўся мэбляй. На прысядзібным участку заклаў сад і вінаградник.

Калі ты, скажы, калі ласка, перажываў у сваім Энрыка-Урвене такія хвіліны, каб да цябе прыходзілі і прасілі ісці і выбіраць суддзю? Ніколі. Тамашні пракурат Гальва і ведаць цябе не хоча. А калі і сутыкне вас лёс, то ён абавязкова пастараецца запраторыць цябе ў каземат або садраць штраф як мага большы.

А мы ўсёй сям'ёй удзельнічалі ў выбарах народнага суддзі і засядацеляў. Усе яны нашы рабочыя, служачыя. Адзін народны засядацель працуе побач са мной на будоўлі. Разам з усімі выбіралі дэпутатаў у Вярхоўны Савет. Вось гэта сапраўдная дэмакратыя.

Вярнуўся на Радзіму і прыняўся добрасумленна працаваць, уносіць свой пасільны ўклад у агульнанародную справу — гонар табе і павага. А будоўляў тут так многа, што дзіву даешся, адкуль бярэцца такая процьма будматэрыялаў. Бадай, за ўсё маё жыццё ў Аргенціне я не бачыў столькі будаўнічых рыштаванняў, колькі бачу я зараз у адным толькі Крыме. І ўсё гэта будуецца, узводзіцца для нашага дабрабыту, для нашага шчасця. Для таго самага шчасця, аб якім мы марылі з табой і тады, калі ўцякалі з панскай Польшчы, і тады, калі корпаліся на плантацыях у правінцыі Чака.

Гэта шчасце я знайшоў спаўна. Хутка мяне будуць прымаць у Камуністычную партыю. Ёй мы абавязаны нашым сапраўдным шчасцем...

Прохар КАРНЮША,
рабочы саўгаса «Сакі».

□

ЛЁГКА ПРАЦУЕЦЦА, ЛЁГКА ДЫХАЕЦЦА

Аргенціна, г. Вісентэ-Лопас.

Антоніо ПЕРЭСУ.

Добра мы жывём зараз. Садзімся за агульны сямейны стол. Пагляджу я на дзяцей, на зяця, і нявестку — твары ў іх свецяцца задавальненнем. А пагляджу на ўнучку і ўнука — і душа радуецца. Дзеці вучацца ў школе, на роднай мове. За іх навучанне бацькам не трэба плаціць. Кончаць школу—адкрыта дарогу ў інстытут. Ім адкрыты ўсе дзверы да ведаў, да святла, да культуры, да шчаслівага юнацтва. А як мог скласціся іх лёс, там, на чужыне? Не, яны б не змаглі атрымаць адукацыі, не хапіла б для гэтага грошай. Так бы і давялося ім усё жыццё капацца на сваёй плантацыі, а то і вандраваць па краіне ў пошуках работы. Уласнага кутка яны не знайшлі б нават на самай доўгай вуліцы свету—Рывадав'я ў Буэнас-Айрэсе. Яна мае каля 20 тысяч дамавых нумароў, але для бедняка, беспрацоўнага не знаходзіцца месца і ў яе дамах.

Уся наша сям'я працуе. Я працую ў будаўнічай брыгадзе Сімферопальскага цагельнага завода. Сын Васіль—токар завода імя Куйбышава, дачка Зіна і нявестка Галя — работніцы кансервавага завода «Працоўны Кастрычнік», зяць Уладзімір—сталяр. Ну, а жонцы, зразумела, застаецца быць хатняй гаспадыняй. Сям'я, дзякуй богу, працавітая і любіць паесці. Дзеці патрабуюць дагляду. Так што старой без справы сумаваць не даводзіцца. Але яна рада. Рада таму, што ў доме поўны дастатак.

Менш 100 рублёў у месяц я ёй не прыношу. Сын ды зяць не адстаюць ад мяне, старога. Добра зарабляюць і нашы маладзіцы. Тое, што мы зараз маем у месяц, у Аргенціне не змаглі б зарабіць і за год.

А калі ў сям'і дастатак, лёгка працуецца і весела адпачываецца. Хутка мы справім наваселле. Дом, які будуем сабе ў Мар'іна, умяшчальны, светлы, утульны. Вакол яго разаб'ём сад. Так, зусім іншым жыццём жывём мы ў Савецкай краіне.

Іосіф ГАЛАВАЧ,
рабочы Сімферопальскага цагельнага завода.

Я СПАКОЙНЫ ЗА ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

Аргенціна, правінцыя Буэнас-Айрэс,
г. Ломас дэ Самора

Палагеі АРЫШЧЫН.

Паважаная тав. Палагея! Вы просіце мяне, каб я напісаў вам праўду аб жыцці ў Савецкім Саюзе. Я, тав. Арышчын, усё сваё жыццё адстайваю толькі праўду і ненавіджу ўсякую няпраўду. Таму я вам скажу адкрыта: хто ўзводзіць паклёпы на нашу сацыялістычную Радзіму, той, хоча ён гэтага ці не, служыць ворагам свайго народа — імперыялістам.

Пасля аднамесячнага знаходжання ў родным краі я ўступіў у члены прафсаюза, а яшчэ праз месяц мяне выбралі ў прафсаюзны рабочы камітэт. У камітэце мне даручылі быць адказным за работу ў клубе і за бібліятэку. Праз адзінаццаць месяцаў работы мне выдалі пуцёўку ў дом адпачынку. Я спачатку адмаўляўся, лічыў, што не заслужыў сваёй працай адпачынку, але мне сказалі, што ў Савецкім Саюзе кожны сумленны чалавек усімі паважаемы і яму па заслугах належаць усе ільготы, прадастаўленыя савецкім законам.

Сёлета вырашчаны вялікі ўраджай фруктаў і вінаграду. Адпраўляем іх у санаторыі і дамы адпачынку, якіх у Крыме больш сотні. Адпачываюць і лечацца тут працоўныя.

Трэба вам прызнацца, што і я, стары бабыль, некалі бяздомны аргенцінскі абрэра (рабочы), нядаўна ажаніўся. Чаму? Цяпер я спакойны за свой сённяшні і заўтрашні дзень. У мяне свая кватэра, работа. Мяне паважаюць, са мной лічацца, прыслухоўваюцца да маёй думкі. Я ведаю, што і старасць мая будзе забяспечана. Адным словам, я стаў сапраўдным чалавекам. Дык чаго ж баяцца, чаму не ажаніцца?.. Такой упэўненасці ў мяне не было на чужыне. Гора я там перажыў столькі, што і за некалькі дзён не раскажаш. А пра жаніцьбу і думаць не было калі...

Тут нас сустракалі, як самых дарагіх людзей. Выдалі грашовую дапамогу, пацікавіліся, дзе кожны з нас хоча жыць і працаваць. Выбраў Крымскую вобласць — вобласць садоў і вінаграднікаў. Я па праву пасяліўся на той багатай зямлі, дзе калісьці марнатравілі жыццё багацеі, арыстакраты і іншыя міраеды.

Так, паважаная Палагея, я просты рабочы чалавек, які пабачыў і адчуў на сваім вяку многа гора і зменлівасць лёсу, знайшоў сваё сапраўднае месца на зямлі, знайшоў, нарэшце, любімую і добрасардэчную маці-Радзіму.

Рыгор БРУНЕЦ,
кветкавод саўгаса «Гурзуф».

Чараўніца-зіма.

Фота П. Нікіціна.

СВЯТА ЗІМЫ

У працоўных Мінска ёсць добрая традыцыя. Штогод у сярэдзіне лютага яны адзначаюць свята зімы, якое праходзіць з песнямі, бадзёрымі танцамі і жартоўнымі гульнямі. Так было і ў мінулую нядзелю ў парку імя Чалюскінцаў.

Свята пачалося ў 12 гадзін дня. А за пяць мінут да яго адкрыцця над паркам прагучалі фанфары: «Слухайце ўсе». Як толькі сціхлі гукі труб, на заснежаных алеях з'явіліся рускія тройкі з незвычайнымі пасажырамі ў санях. Едуць героі народных казак.

У цэнтры парку кавалькада спыняецца. З саней выходзяць дзед-мароз і клоун. Яны віншуюць мінчан са святам зімы, жадаюць ім шчасця ў жыцці і поспехаў у працы. Ля снежнай прыгажуні, якая ўвасабляе зіму, грымнуў аркестр. І пайшлі, закружыліся вясёлыя карагоды. Павольныя рускія танцы змянялі бадзёрая беларуская лявоніха, украінскі гапак.

А ўздоўж алей узнімаецца лёгкі дымок. Гэта закіпаюць самавары, смажацца шашлыкі, пякуцца бліны. Да накрытых сталоў удзельнікаў свята запрашаюць музыкі. Яны ліха граюць на цымбалах, скрыпцы.

У другім канцы парку, дзе канчаецца сцяна сасновага бору, спаборнічалі лыжнікі, каталіся на санках дзеці і дарослыя. Свята зімы было вясёлым днём адпачынку для многіх тысяч мінчан.

НАШ АДРАС

Мінск, Ленінскі праспект, 77. Дом друку. Для пісьмаў: Мінск паштовая скрынка № 14.

РЭДКАЛЕГІЯ.